служыць матэрыяльнай асновай для вырашэння камунікатыўных, пазнавальных задач, прадугледжаных праграмай.

5. Прынцып жанравай рэпрэзентатыўнасці, які прадугледжвае падбор тэкстаў з улікам ключавых функцый: інфарматыўнай – для перадачы ведаў, звестак, іншай інфармацыі, тлумачальнай – для характарыстыкі, аргументацыі важных фактаў пісьма. Прычым тэксты гэтыя мусяць адлюстроўваць спецыфіку фарміравання сучаснай нормы, зафіксаванай у Законе Рэспублікі Беларусь "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" (2008 г.).

6. Прынцып даступнасці тэкстаў, згодна з якім патрабуецца ажыццяўляць пэўную адаптацыю асобных фрагментаў з улікам узросту, інфармацыйнай культуры студэнтаў, прымяняць прыёмы папулярызацыі (тлумачэнне асобных тэрмінаў, параўнанне з'яў і фактаў і інш.).

**Заключэнне**. Хрэстаматыя як вучэбнае выданне мае дакладна вызначаную структуру. Мяркуецца, што тэксты, уключаныя ў кнігу, будуць суправаджацца невялікімі даведкамі пра аўтараў і кароткімі каментарыямі. Даведачны апарат хрэстаматыі па сваім характары набліжаецца да апарату навуковых выданняў.

Падрыхтаваная хрэстаматыя можа прымяняцца ў спалучэнні з канспектам лекцый, іншымі дапаможнікамі, а таксама можа мець самастойнае значэнне вучэбнай кнігі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што складанне хрэстаматыі з'яўляецца складаным і карпатлівым працэсам. Добра сканструяваная хрэстаматыя ў значнай ступені будзе спрыяць павышэнню прафесійнай кампетэнцыі будучага спецыяліста – рэдактара-тэхнолага.

ЛІТАРАТУРА

1. Куликович, В. И., Воронецкая, А. В. Графико-орфографические ошибки в белорусскоязычных медиа: лингвистические и экстралингвистические факторы / В. И. Куликович, А. В. Воронецкая // Коммуникативная культура: история и современность : материалы XI Междунар. науч.-практ. конф. 29 окт. 2021 г. : в 2 ч. / редкол.: О. Д. Журавель (отв. ред.), А.С. Зуев (отв. ред.), Ю. С. Елисеева (отв. секретарь) [и др.]; Новосиб. гос. ун-т. – Новосибирск : ИПЦ НГУ, 2021. – Ч. 1. – С. 250–254.

2. Кулiковiч, В. I. Праблемныя аспекты аўтаматычнага перакладу з рускай мовы на беларускую: парады рэдактару / У. I. Кулiковiч // Слова ў кантэксце часу [Электронны рэсурс] : матэрыялы 5-й Мiжнар. навук.-практ. канф., Мiнск, 11 сак. 2024 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А.В. Бяляеў (гал. рэд.) [i iнш.]. – Мiнск : БДУ , 2024. – С. 159–164. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM). – ISBN 978-985-881-683-4.

небудзь галіне ведаў – мастацкіх, навуковых, публіцыстычных і інш., або ўрыўкаў з такіх тэкстаў. Дыдактычным аспектам хрэстаматыя адрозніваецца ад анталогіі.

Пры стварэнні хрэстаматыі для рэдактараў як асобага роду вучэбнага дапаможніка патрабуецца вырашэнне двух задач: 1) выбар адзінкі навучання; 2) вызначэнне прынцыпаў складання хрэстаматыі.

У якасці адзінкі вучэбнага матэрыялу мы прапануем абраць звязны тэкст як цэласную камунікатыўную адзінку, якая дазваляе фарміраваць у студэнтаў як лінгвістычную, так і камунікатыўную кампетэнцыі. Сярод найбольш важных прынцыпаў складання хрэстаматыі для прафесійнай падрыхтоўкі будучых рэдактараў можна выдзеліць наступныя.

1. Прынцып адпаведнасці матэрыялаў хрэстаматыі мэце і задачам навучання. Важна, каб на аснове выдання ў студэнта мэтанакірава фарміраваліся лінгвістычныя, навукова-даследчыя, камунікатыўныя, сацыяльна-асобасныя, навукова-метадычныя, агульнанавуковыя і карэктарска-рэдактарскія кампетэнцыі. Каб пасля азнаямлення з прапанаванымі тэкстамі выпускнікі маглі весці кампетэнтны дыялог з аўтарамі адносна выбару таго ці іншага напісання.

2. Прынцып уліку і захавання канстытуіруючых прыкмет тэксту. Курс "Дынаміка нормаў сучаснай беларускай мовы" абапіраецца на веды студэнтаў, атрыманыя на занятках па беларускай і рускай мовах і функцыянальнай стылістыцы беларускай мовы. Таму тэксты хрэстаматыі павінны паглыбляць тэарэтычныя веды, дапаўняць іх, а таксама выводзіць у новыя напрамкі даследавання існаваных практычных праблем беларускага пісьма, спрыяць яго нармалізацыі.

У тэкстах, уключаных у хрэстаматыю, на наш погляд, павінны захоўвацца сінтагматычная і семантычная звязнасць, цэласнасць, завершанасць, інфармацыйнасць.

3. Прынцып уліку міжпрадметных сувязей, непасрэдна звязаны з прынцыпамі інфарматыўнасці і навізны. Курс "Дынаміка нормаў сучаснай беларускай мовы" дазваляе інтэграваць і абагульняць веды, атрыманыя па розных дысцыплінах, што вывучаюцца ў працэсе падрыхтоўкі рэдактара-тэхнолага ("Уводзіны ў спецыяльнасць", "Рэдагаванне навукова-тэхнічных выданняў", "Рэдагаванне даведачнай літаратуры", "Агульны курс рэдагавання", "Рэдагаванне літаратурна-мастацкіх выданняў", "Тэхналогія рэдакцыйна-выдавецкага працэсу").

4. Прынцып функцыянальнасці заключаецца ў тым, што для стварэння заяўленай хрэстаматыі прапануюцца тэксты, якія могуць служыць практычнымі рэкамендацыямі для вырашэння рэальных рэдактарскіх і карэктарскіх аспектаў падрыхтоўкі тэксту, а таксама

УДК 811.161.3’374

У.І. Куліковіч,
канд. філал. навук, дацэнт кафедры
рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій
(БДТУ, Мінск)

# ПРЫНЦЫПЫ СКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ХРЭСТАМАТЫІ ДЛЯ РЭДАКТАРАЎ «ДЫНАМІКА НОРМАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ. ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ»

**Уводзіны**. Праграма курса для рэдактараў “Дынаміка нормаў сучаснай беларускай мовы” прадугледжвае вывучэнне на лекцыйных (20 гадзін) і практычных (20 гадзін) занятках найбольш складаных пытанняў, а таксама інавацыйных аспектаў праблемнай тэматыкі, зварот да літаратурных крыніц, рэгулярнае прафесійнае чытанне тэкстаў, дзе разглядаюцца нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Яго актуальнасць абумоўлена існаванымі праблемамі якаснай падрыхтоўкі беларускамоўных выданняў [1, 2].

Сярод асноўных задач курса – атрымаць пэўны аб’ём інфармацыі, навучыцца крытычна асэнсоўваць тэарэтычныя палажэнні, супастаўляць графіка-арфаграфічныя факты роднай мовы з фактамі рускай мовы, рабіць самастойныя абагульненні і высновы з назіранняў над тэкставым матэрыялам, на аснове прачытанай спецыяльнай літаратуры.

Для фарміравання актуальных інфармацыйных запатрабаванняў патрэбна поўная сістэма тэкставых матэрыялаў па дысцыпліне, каб чытацкая дзейнасць студэнта была накіравана на думку як прадмет гэтай дзейнасці, забяспечвалася раскрыццём тэмы ў сістэме прадметна звязаных тэкстаў глыбока і поўна. Вырашэнню праблемы можа спрыяць стварэнне хрэстаматыі па ўказанай дысцыпліне.

Задача артыкула – распрацаваць асноўныя прынцыпы складання вучэбнай хрэстаматыі для рэдактараў з рабочай назвай «Дынаміка нормаў беларускай мовы. Графіка і арфаграфія».

Вынікам звароту студэнтаў да навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, звязанай з графікай і арфаграфіяй, стане: па-першае, узбагачэнне ведаў студэнтаў; па-другое, фарміраванне уяўленняў пра асноўную праблематыку арфаграфіі; па-трэцяе, развіццё ўменняў арыентавацца ў сучасных графіка-арфаграфічных прынцыпах; па-чацвёртае, фарміраванне сучасных уяўленняў адносна маўленчай дзейнасці і графіка-арфаграфічнай варыянтнасці.

**Асноўная частка**. Хрэстаматыяй (греч. chrestomátheia, ад chrestós – карысны и manthano – вучуся) прынята лічыць вучэбнае выданне, змест якога складаюць сістэматызаваныя матэрыялы па якой-